

# Тамара МАЗУР

Тамара Міхайлаўна МАЗУР – паэт, журналіст, член  Саюза пісьменнікаў Беларусі. Нарадзілася ў вёсцы Лазы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. Працоўны шлях пачала пасля заканчэння Роскай СШ лінатыпісткай Гродзенскай узбуйненай друкарні. У 1998 годзе закончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 1988 года да канца 2020 года працавала на розных пасадах, творчых і кіраўнічых, у рэдакцыях рэгіянальных і рэспубліканскіх газет у Стоўбцах і Мінску, Ваўкавыску і Гродне. Сумяшчала журналісцкую дзейнасць з працай педагога дадатковай адукацыі ў Гродзенскім раённым цэнтры творчасці дзяцей і моладзі.

Тамара Мазур з'яўляецца аўтарам пяці выдадзеных кніг паэзіі, прозы і публіцыстыкі: «Спакуса траўня» (1995), «Ваўкавыск – радзімка Беларусі» (2005), «Пакуль кахаю…» (2013), «Скидляне. Скидельцы. Скидельчане» (2021), «Як мае быць…» (2021).

Паэтычныя творы Т. Мазур у перакладзе на польскую і рускую мовы выйшлі ў свет у анталогіі «Mosty: Warszava – Grodno. Гродна – Варшава» (2017) і зборніку  «Не отрекайся от мечты» (Растоўская вобласць, 2018). Паэма «Споведзь адной душы» ўключана ў кнігу «Женщины Гродненщины: прошлое, настоящее, будущее» (2010).

Вершы паэткі друкаваліся ў літаратурных часопісах «Першацвет», «Маладосць» і «Полымя», альманахах «Галасы» і «На Нёманскай хвалі», калектыўных зборніках «Дзе расце сон-трава», «Люблю цябе, мая старонка…», газетах «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», «Рэспубліка», «Наш час» і іншых.

На працягу апошніх гадоў творчае натхненне Тамара Мазур чэрпае ў г. Скідзель і г. Масты на Гродзеншчыне, дзе працуе і жыве.

mazur.tamara.m@mail.ru
**+375 29 575 02 78**

## Мой свет

Мой свет пафарбаваўся ў колер новы,
Смакуе зноўку прагу да жыцця,
Вясны святло лягло ў яго аснову,
А ў ім так шмат адценняў пачуцця.

Мой свет адрокся ад пустой трывогі,
Шануючы каханне і любоў.
У ім пераплятаюцца дарогі
Паміж бярозаў, ліпаў і дубоў.

Паміж такіх прываблівых палеткаў,
Засцеленых шыкоўным дыванам,
З узорамі травіначак і кветкаў.
Што мне здаюцца чарадзеным сном.

У ім так лёгка і надзіва проста,
Без лішняе прынукі і хлусні.
Мой свет – не віртуальны і не востраў,
Ён на маёй радзіме, ля радні

Без золата – льняны і паркалёвы.
Па ім гуляе месяц, як дзіця.
Вясны святло лягло ў яго аснову,
А гэта значыць – прага да жыцця.

## Прыходзіць час

Прыходзіць час,
калі не можаш больш маўчаць,
не можаш назіраць і не дзяліцца.
не можаш болей свят не адзначаць,
не радавацца дням, не весяліцца.

Прыходзіць час,
калі не можаш быць глухім,
а хочаш чуць салоўку і зязюлю.
Разменьвацца не хочаш дарагім,
як нейкаю салодкаю пілюляй.

Прыходзіць час,
калі паміж вятроў,
насуперак дажджу і нават граду,
насуперак жаданням несяброў
бярэшся давясці сваё да ладу.

Не толькі дом, але і ўласны свет,
свае пачуцці зацугляць, як коней.
Прыдумаць для нашчадкаў запавет,
і прачытаць… маршчынкі на далонях.

## Да роднай мовы

Да роднай мовы  як да Бога –
і гэта ўжо не навіна.
Ідзі туды сваёй дарогай,
ідзі… Адна?

О, Божа! Мова стала мэтай,
штрыхом на белым палатне,
наканаваннем і сакрэтам,
што выпрабоўваюць мяне.

О, Божа! Гэтая дарога –
святая памяць землякоў.
Аб камяні збіваю ногі,
і рада, што няма акоў.

Я чую ціхі голас продкаў
праз пласт стагоддзяў і масты:
– Да роднай мовы аднагодкаў
яшчэ вярнуць паспееш ты.

Яшчэ раскажаш  праўду дзецям,
як болем пішаш кожны верш…
Прыблудаў больш і больш на свеце,
а беларусаў  менш і менш.

## У  свеце музыкі

У свеце музыкі – твая душа,
у свеце музыкі – тваё багацце.
Табе наканавана прачынацца
тут, на Зямлі,  і ўмомант вырашаць:
сабою быць, ці ценем заставацца?

Сабою быць – зусім не просты шлях,
ён падуладны кемлівым і строгім,
з’ядноўвае маленькія дарогі,
раскідваючы росы на палях,
паказвае святло для многіх.

У свеце музыкі – прастор і рух.
Яго адчуй аднойчы, каб засвоіць,
як не зрабіцца лішнім ці ізгоем,
і ўмацаваць свой неўтаймоўны дух
у свеце музыкі жывой,
не зброі.

## Вясна

Замест нерухомасці – вольнасці вецер
Між дрэваў, дамоў, гаражоў і павецяў.
Заместа застылага неба – нарэшце! –
Аблокі плывуць, як у вобразным свеце.

Заместа знямелага белага смога
З'явілася гэта зямная дарога.
Няхай сабе мокрая, сціплая, шэрая,
Але, як нішто, зніταваная з вераю.

У гэту вясну, як штогод і заўсёды…
Няхай уладараць законы прыроды,
Прачнуцца ў пупышках сагрэтыя дрэвы,
Пачуюцца птушак свавольныя спевы.

І заўтра цішком я заўважыць пасмею,
Што не падазрона, нарэшце, віднее.
А толькі ад сонца, што ззяе на ўсходзе,
І гэтай вясной, як штогод, у прыродзе.

## Калі б паэтам ты не быў…

Калі б паэтам ты не быў,
не разгадаў бы сутнасць кветкі,
пяшчоты б гэтулькі не піў
ад закаханае паэткі.

Калі б паэтам ты не быў,
то не адчуў бы скарб імгнення,
і ўжо даўным даўно б забыў
вясну – у восеньскім сталенні.

Калі б паэтам ты не быў,
то без лірычнай асалоды,

узбагачаючай наўздзіў,
нідзе б не зведаў смак свабоды.

Калі б паэтам ты не быў.

## А Бог прабачыць

А Бог прабачыць зможа грэх
табе – ужо за тое,
што мне вярнуў шчаслівы смех
і зняў ад сэрца злое.
Што адрадзіў маю душу,
якой няма спакою:
ізноў пісьмо табе пішу
царыцаю ў спакоі.

І смутак леташні сыйшоў
за далягляд барвовы.
Хай не хапае трапных слоў
і блытаюцца словы.
Я знаю месца на зямлі
сваё… І прызначэнне.
З табой мы шчырымі былі –
і наша ў тым збавенне.

## Каханне без спатканняў

Каханне без спатканняў – гэта гонар,
Ці, ганарлівасць, як каму здаецца.
Яно, нібы спакутаваны донар,
Усё яшчэ на нешта спадзяецца.

Яно дае энергію прыроды,
Хоць патрабуе немалой увагі.
Каханне без спатканняў – асалода,
На шалях закалёнай раўнавагі.

Яно прыходзіць нібы паратунак
Ад доўгай брукаванае дарогі.
Каханне без спатканняў – падарунак
Ад космаса і ад самога Бога.

## За талент

За талент палюбіце  чалавека,
Адораны ён ім невыпадкова.
І так было не ўчора, а спрадвеку, –
Таленавіты права меў на слова.

Рамеснікаў без таленту багата
Сярод хацінаў і апартаментаў.
Але між іх заўжды былі – для свята
І захаплення людзі-дыяменты.

Без іх наш свет здаваўся б надта  шэры,
Без іх заўсёды не хапала б фарбаў.
Без талентаў ніхто б ужо не верыў,
Што ёсць духоўныя на свеце скарбы.